ЭТАЛОН ONLINE
Официальная правовая информация
Информационно-поисковая система "ЭТАЛОН-ONLINE", 11.03.2024
Национальный центр правовой информации Республики Беларусь

УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

2 лютага 2024 г. № 44

# Аб узнагароджанні вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны»

У сувязі са святкаваннем 80-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, а таксама ў мэтах увекавечання подзвігу воінаў Чырвонай Арміі, працоўных, партызан і падпольшчыкаў, здзейсненага імі пры абароне і вызваленні беларускіх гарадоў і іншых населеных пунктаў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пастанаўляю:

1. За мужнасць і стойкасць, праяўленыя абаронцамі беларускіх гарадоў і іншых населеных пунктаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, узнагародзіць вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны»:

гарадскі пасёлак Асвея;

горад Асіповічы;

горад Баранавічы;

горад Дзяржынск;

горад Дзятлава;

горад Калінкавічы;

горад Любань;

гарадскі пасёлак Обаль;

горад Чавусы.

2. Фінансаванне расходаў на выраб вымпелаў «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны» і ганаровых грамат да іх ажыццявіць у межах сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце ў 2024 годзе Міністэрству абароны на ўтрыманне Узброеных Сіл.

3. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** **А.Лукашэнка**